СТАРОНКІ ПАРТЫЗАНСКАГА ЖЫЦЦЯ 5

ВЫБАР І ПРАЎДА УЛАДЗІМІРА ГРОМАВА 10

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

16 КРАСАВІКА 2022 г. СУБОТА

№ 74 (29696)

ЗВЯЗДА

Насустрач цудоўнай вестцы

Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Вялікдзень 17 красавіка 2022 года

Дарагія суайчыннікі!

Прыміце самыя шчырыя віншаванні са светлым святам Вялікадня!

У гэтыя ўрачыстыя дні сэрца кожнага верніка раскрываецца насустрач цудоўнай вестцы аб Хрыстовым Уваскрэсенні, дзякуючы якому ў нас з новай сілай абуджаюцца вера, любоў і надзея, з'яўляецца імкненне да стварэння і добрых спраў.

Гэты душэўны ўздым дае нам сілы дапамагаць тым, хто мае патрэбу ў чалавечай цеплыні, ахове, ежы і прыстанішчы.

Няхай хрысціянская дабрадзейнасць і ў далейшым будзе духоўным шчытом нашага народа і роднай Беларусі. Няхай радасць вялікодных дзён напаўняе душы мудрасцю, адзінствам і згодай.

Жадаю вам моцнага здароўя, мірнага неба над галавой, шчасця і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Касцёл Святой Троицы (Святога Роха) на Залатой Горцы ў Мінску.

Фота Анатоля КЛЕЦКАВА.

Свежы погляд на актуальныя праблемы

Прэзідэнт абмеркаваў пытанні адукацыі з рэктарам Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта

Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Алегам Раманавым, сенатарам, рэктарам ПДУ, і кіраўніком сваёй Адміністрацыі Ігарам Сергеенкам учора ў Палацы Незалежнасці. Падчас размовы закранулі пытанні адукацыі, выхавання моладзі і ролі грамадскіх арганізацый у гэтых працэсах.

«Алег Аляксандравіч, я хацеў бы з вамі некалькі дэталяў абмеркаваць. Зразумела, гэта адукацыя. З вашага погляду, што яшчэ мы тут не дацягнулі, не зрабілі? Другая — моладзь і грамадскія арганізацыі, іх роля ў грамадстве. Як узмацніць іх ролю з улікам нядаўніх падзей, асабліва 2020 года? Хачу пачуць ваш свежы погляд на гэтыя праблемы», — агучыў кіраўнік краіны тэмы для размовы.

У інтэрв'ю з журналістамі Алег Раманаў адзначыў, што з Прэзідэнтам абмеркавалі шэраг пытанняў па развіцці адукацыі і ролю грамадскіх аб'яднанняў.

«Прэзідэнта цікавала, наколькі паспяхова рэалізоўваецца дзяржаўная палітыка ў сферы адукацыі. Я засяродзіў увагу на тэндэнцыях развіцця вышэйшай адукацыі, на тым, якія задачы сёння стаяць перад універсітэтамі і ў прыватнасці перад Полацкім дзяржаўным універсітэтам, які я ўзначальваю. Прэзідэнт задаў пытанне пра тое, якую ролю ў сучасным універсітэце іграюць маладзёжныя і іншыя аб'яднанні. Я падрабязна расказаў, як выбудавана работа, і ўнёс прапановы па ўдасканаленні гэтай дзейнасці», — сказаў рэктар ПДУ.

Па яго словах, на ўзроўні звычайнага студэнта роля аб'яднанняў выяўляецца ў дапамозе яму сацыялізавацца, засвоіць якасці, неабходныя для жыцця ў нашым грамадстве.

«Калі казаць пра ролю маладзёжных і іншых аб'яднанняў на макраўзроўні, то іх задача ў тым, каб быць адным з праваднікоў дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі і ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці. З іх дапамогай маладым людзям неабходна атрымаць не толькі ўяўленне аб ідэалогіі, а зрабіць яе часткай сваёй унутранай культуры», — падкрэсліў суразмоўца.

Алег Раманаў акцэнтаваў, што Прэзідэнт выказаў зацікаўленасць у тым, каб універсітэты былі культурнымі цэнтрамі, дзе адбываецца не толькі прафесійнае, але і асабоснае, сацыяльнае, ідэалагічнае выхаванне маладых людзей.

Марыя ДАДАЛКА.

Каштоўнасці

Ад жанчыны залежыць многае

У Мінску адбыўся II Рэспубліканскі жаночы форум «Мір у руках жанчыны»

Актыўныя і ініцыятыўныя жанчыны з усіх рэгіёнаў краіны, прадстаўніцы ўсіх сфер дзейнасці сабраліся ў Палацы Рэспублікі, каб абмеркаваць ролю жанчыны ў сучасным свеце. Першы падобны форум стаў рэакцыяй жаночай супольнасці на жнівеньскія падзеі 2020 года. Тады гэтую ініцыятыву — збірацца жаночым калектывам і ўдзельнічаць у жыцці краіны — вырашылі працягнуць. Цяпер гэта традыцыя.

Фота БелТА.

— Наш першы форум стаў яркай старонкай у гісторыі суверэннай Беларусі, — падкрэсліла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.** — Менавіта тады, у той няпросты час, ён як нікалі згуртаваў нас. Мы паставілі заслону спробам ачарніць светлы вобраз беларускай жанчыны: жанчыны-маці, жанчыны-працаўніцы, жанчыны-захавальніцы міру і сямейнага ачага. Было непрыста, але мы аб'ядналіся для таго, каб быць разам.

Спікер верхняй палаты парламента агучыла прывітальны адрас Прэзідэнта ўдзельнікам і гасцям форуму. «На імкненні да любові і стварэння прыгожай паловы чалавецтва шмат у чым трымаецца дабрабыт кожнай нацыі. Сямейныя, культурныя, духоўныя традыцыі мы бяром з малаком маці і застаёмся верныя ім на працягу ўсяго жыцця», — гаворыцца ў прывітанні. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Беларускі саюз жанчын аб'ядноўвае людзей з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. «Вы дасягнулі нямалых вяршынь у прафесійнай кар'еры, заўсёды знаходзіце час не толькі для сям'і, але і для значнай грамадскай работы: прывіваеце падрастаючаму пакаленню любоў да Радзімы, дапамагаеце захоўваць памяць аб гераічным мінулым нашага народа, падтрымліваеце ветэранаў. Дзякуючы вам у складаны для краіны час перакананчы і сумленны голас беларускай жанчыны гучыць з айчынных і міжнародных трыбун», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў удзельнікам і гасцям форуму, а таксама іх блізкім моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту і мірнага неба над Беларуссю.

Старшыня Савета Рэспублікі заўважыла, што ў сучасным свеце, дзе так шмат злосці, нянавісці і падману, роля жанчыны, несумненна, узрастае. «Мы з вамі павінны зрабіць усё дзеля таго, каб захаваць мір і згоду, — гэта ў нашых сілах, — акцэнтавала ўвагу Наталля Качанава. — Сёння кожная жанчына разумее адказнасць за будучыню не проста сваёй краіны — за будучыню нашых дзяцей, тых пакаленняў, якія ідуць за намі».

СТАР. 2

Ваеннае пакаленне — мірнаму пакаленню

«БЫЛО АДНО ЖАДАННЕ — ІСЦІ Ў БОЙ І ПЕРАМАГЧЫ»

Ветэран Вялікай Айчыннай вайны — пра жыццё ў акупацыі і свае франтавыя дарогі

У свае 95 Антон ЗУБОЎСКІ выглядае гадоў на дваццаць маладзейшым. Даволі незвычайны для такога ўзросту і яго лад жыцця: Антон Сцяпанавіч сам ходзіць у краму па прадукты, гатуе ежу, сочыць за парадкам у хаце, шмат гуляе на вуліцы. З памяццю, дзякуй богу, таксама ўсё добра: і пра дзяцінства раскажа, і пра жыццё ў акупацыі, і пра тое, як ваяваў на фронце, а затым уладкоўваў сваю будучыню ўжо пад мірным небам.

Даручэнне — адвезці павесткі

Нарадзіўся Антон Зубоўскі ў вёсцы Крупка, што на Пухавіччыне, у сям'і калгаснікаў. Бацькі выхоўвалі траіх дзяцей. Ён быў яшчэ малы, калі ад сухотаў памерла маці. Бацька ажаніўся другі раз — на свет з'явілася яшчэ трое дзетак. У роднай вёсцы Антон скончыў чатыры класы беларускамоўнай школы. З пятага да сёмага класа вучыўся ў Мар'інай Горцы. Працягнуць адукацыю не давялося — пачалася Вялікая Айчынная вайна.

СТАР. 5

Інфармацыйны падман

НЕ ПАДДАЦЦА ЎПЛЫВУ

Навошта нам крытычнае мысленне і як яго развіваць?

Супраць каго накіраваны інфармацыйныя войны, каму яны выгадныя і як працуе іх механізм? Навошта нам крытычнае мысленне? І як яно дапамагае не паддавацца ўплыву інфармацыйных войнаў? Як развіць у сабе ўменне ацэньваць сітуацыю максімальна аб'ектыўна і прымаць правільныя рашэнні? Як не страціць крытычнае мысленне з узростам? Чаму нас так лёгка падмануць, кім бы мы ні былі: знакамітым вучоным ці дасведчаным чалавекам? Якія нашы недахопы і недасканаласці не даюць нам выйсці за звыклыя рамкі і чым шкодзіць шаблоннае мысленне? Пра гэта і іншае гутарым з нейрахірургам, навукоўцам супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гуменам ГУРБАНІДЖАДАМ.

— Доктар Гумен, чаму тэма інфармацыйных войнаў такая актуальная сёння?

— Мы жывём у той перыяд развіцця цывілізацый, калі пастаянна трапляем пад псіхалагічнае ўздзеянне розных інфармацыйных і ментальных войнаў, яны атакуюць нас з розных бакоў. Гэта адназначна можа мяняць наша жыццё і той кірунак, куды мы рухаемся. Яны атрымалі цяпер такое развіццё, што няма чалавека, які б з імі не сутыкаўся, гэта датычыцца літаральна кожнага.

СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Савеце Федэрацыі РФ заявілі аб хуткім завяршэнні спецаперацыі Расіі ва Украіне

Намеснік старшыні камітэта Савета Федэрацыі па міжнародных справах Андрэй Клімаў заявіў, што спецыяльная ваенная аперацыя Расіі ва Украіне хутка завершыцца. Аб гэтым ён сказаў падчас брыфінгу са СМІ Афрыкі і Азіі, перадае РІА «Новости».

«Спецыяльная ваенная аперацыя РФ даволі хутка скончыцца, мы не збіраемся яе спецыяльна расцягваць», — сказаў парламентарый.

Паводле яго слоў, гэта адбудзецца адразу ж, як толькі Украіна стане «бяспечнай для Расіі, усяго свету» і будзе вырашана пытанне з біялагічнымі лабараторыямі і гарантаваннем бяспекі ядзерных аб'ектаў.

Пры гэтым сенатар адзначыў, што краіны Захаду працягваюць напампоўваць Украіну ўзбраеннем, «заліваючы вогнішча бензінам».

Амаль 80 працэнтаў нямецкіх кампаній чакаюць фінансавых цяжкасцяў з-за падзей ва Украіне

Вынікі даследавання, якія змешчаны са справаздачы German Business Panel Monitor за красавік, сведчаць, што амаль 80 працэнтаў кампаній у Германіі чакаюць, што сутыкнуцца з сур'ёзнымі фінансавымі цяжкасцямі на фоне падзей ва Украіне. Аб гэтым паведамляе ТАСС.

Згодна з даследаваннем, продажы і чаканы прыбытак рэзка ўпалі пасля пачатку спецыяльнай ваеннай аперацыі Расіі ва Украіне. Пры гэтым удакладняецца, што нават адмена большасці абмежавальных мер, накіраваных на стрымліванне тэмпаў распаўсюджвання каранавіруса, не дазволіла палепшыць сітуацыю. Як паказваюць вынікі апытання, асабліва кампаніі занепакоены ростам цэн на энерганосьбіты і магчымымі збоямі ў ланцугах паставак.

Нягледзячы на тое, што большасць фірм (больш за 60 працэнтаў) падтрымалі санкцыі адносна Расіі, магчымае ўвядзенне эмбарга на імпарт нафты і прыроднага газу з РФ выклікала неадназначную рэакцыю. Хоць 41 працэнт кампаній выказаліся за спыненне паставак расійскіх энерганосьбітаў, амаль столькі ж (36 працэнтаў) адмоўна адносяцца да такой меры.

Раней вядучыя эканамічныя інстытуты Германіі скарэкціравалі ў бок зніжэння прагноз па аднаўленні эканомікі краіны ў 2022 годзе. Паводле іх ацэнак, у бягучым годзе ВУП Германіі вырасце толькі на 2,7 працэнта, а ўзровень інфляцыі складзе 6,1 працэнта.

Кім Чэн Ын падарыў раскошную кватэру тэлевядучай, якая выйшла на пенсію

Лідар Паўночнай Карэі Кім Чэн Ын падарыў вядомай тэлевядучай Ры Чун Хі, якая выйшла на пенсію, раскошную двухузроўневую кватэру. Пра гэта паведамляе Scroll.In.

На відэа, распаўсюджаным мясцовым тэлебачаннем, паказана, што лідар краіны асабіста наведаў новае жытло дыктара. Падчас агляду кватэры Ры Чун Хі трымае Кіма Чэн Ына за руку, а кіраўнік Паўночнай Карэі смяецца.

Ры Чун Хі прапрацавала на паўночнакарэйскім тэлебачанні больш за 50 гадоў і шырока вядома на Захадзе як «голас Паўночнай Карэі». Менавіта яна аб'явіла аб усіх важных падзеях краіны, у тым ліку аб выпрабаваннях ядзернай зброі.

КАРОТКА

- Сталічная міліцыя ўзмоцніць кантроль за грамадскім парадкам падчас святкавання Вялікадня.
- **«Белдзяржхарчпрам»: запасу цукру ў краіне хопіць да пачатку сезона перапрацоўкі.**
- Міністэрства аховы здароўя папярэдзіла аптэчныя сеткі аб недапушчальнасці неабгрунтаванага павелічэння кошту лекаў.
- **Колькасць аленяў і казуль у Гродзенскай вобласці з-за будаўніцтва агароджы Польшчай зменшылася на трэць.**
- Па старонках гісторыі: фестываль бясплатных экскурсій пройдзе ў Гомелі 17—18 красавіка. Форум прысвечаны Міжнароднаму дню аховы помнікаў і гістарычных мясцін, які штогод адзначаецца 18 красавіка.
- **Абноўленую фабрыку па вытворчасці кісларoду запусцілі ў Брэсцкай абласной бальніцы.**

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 22074

Парламенцкі дзённік

АКТУАЛЬНЫ СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Арменіі ў Беларусі Размікам ХУМАРАНАМ

«Я шчыра рада вітаць вас у Савеце Рэспублікі. Нашы краіны звязваюць добрыя адносіны, слаўная агульная гісторыя. Вельмі спадзяёмся, што ў далейшым узаемаадносіны Беларусі і Арменіі будуць развівацца плённа, нягледзячы на кан'юнктуру і тое, што адбываецца ў многіх дзяржавах, калі краіны Захаду спрабуюць умешвацца ва ўнутраныя справы, што, вядома, недапушчальна. Нам трэба аб'ядноўвацца, каб гарантаваць бяспеку нашых краін», — сказала Наталля Качанава.

Гістарычныя карані і існуючая дружба паміж народамі, упэўнена спікер верхняй палаты парламента, — залог далейшай работы на карысць дзвюх краін. «Мы бачым, як добра развіваецца гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. Важна, што мы ўзаемадзейнічаем у розных сферах жыццядзейнасці. Безумоўна, для нас значнае супрацоўніцтва паміж парламентарыямі, паколькі гэта тыя людзі, якія павінны стаяць на абароне нацыянальных інтарэсаў, а таксама рабіць усё для цеснага плённага кантакту», — канстатавала яна.

«Нас не могуць не хваляваць некаторыя выказванні калег у Арменіі. Спадзяёмся, што мы ўсё ж такі будзем супрацоўнічаць у прававым рэчышчы, каб гэтыя адносіны развіваліся па-сяброўску. Мы абавязаны зрабіць усё, каб падтрымліваць адзін аднаго на міжнародных пляцоўках, у міжнародных арганізацыях, — звярнула ўвагу Наталля Качанава. — Гаворачы аб павелічэнні тавараабароту, мы разумеем, што ён павінен быць узаемавыгадны. Мы гатовы да работы па ўсіх напрамках: пастаўках нашых тавараў, адкрыцці сумесных вытворчасцяў і прадпрыемстваў».

Падчас сустрэчы бакі абмеркавалі актуальны стан і перспектывы развіцця кантактаў Беларусі і Арменіі ў палітычнай, гандлёва-эканамічнай, інвестыцыйнай, гуманітарнай, культурнай, турыстычнай і іншых галінах. Удзельнікі сустрэчы падкрэслілі, што бакі маюць добры патэнцыял супрацоўніцтва, а таксама пацвердзілі зацікаўленасць у развіцці міжпарламенцкага ўзаемадзеяння.

«Я вельмі рады гэтай сустрэчы, рады сустракацца з яркімі палітычнымі дзеячамі Беларусі. Складана знайсці нейкае інтэграцыйнае аб'яднанне, у якім мы разам не ўдзельнічалі б і не супрацоўнічалі б. Традыцыйная і наша ўзаемападтрымка ў розных міжнародных арганізацыях. Гістарычныя карані нашых народаў і дружба — таксама агульнавядомы факт», — падкрэсліў Размік Хумаран.

Ад жанчыны залежыць многае

(Заканчэнне.

Пачатак на 1-й стар.)

Як заўважыла **кіраўнік прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску, саветнік старшыні Беларускага саюза жанчын Мар'яна ШЧОТКІНА,** тэма форуму абсалютна адпавядае рэчаіснасці: мір у руках жанчыны. «Сёння вельмі шмат пытанняў, якія хвалююць жанчын: гэта, перш за ўсё, мір, а таксама сям'я, стабільнасць, — удакладніла яна. — Жанчыны прадстаўлены абсалютна ва ўсіх кірунках дзейнасці, у якіх прымаюць самы актыўны ўдзел. Місія жанчыны — місія стварэння. У нашай краіне жанчыны заўсёды на перадавой побач з мужчынамі. Жанчыны ніколі не дазволяць, каб чужыя боты тапталі нашу зямлю, каб быў парушаны мір у нашай краіне. Мы заўсёды будзем адзіныя з усім народам, нашым Прэзідэнтам. Адзінства — гэта наша сіла. У Год гістарычнай памяці вельмі важна, каб асаблівую ўвагу мы ўдзялялі нашым дзецям і моладзі, выхоўвалі іх у тых традыцыях, у якіх выхоўвалі нас нашы бацькі, дзяды і бабулі. Няма нічога больш важнага, чым мір, краіна, сям'я».

Удзельніцы форуму — прадстаўніцы розных сфер. «Гэта звычайныя жанчыны, якія вырошчваюць хлеб і кіруюць сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі, якія працуюць у прамысловасці, гэта наша моладзь, прадстаўнікі сілавых структур, жанчыны мастацтва, — паведаміла **старшыня камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, старшыня Беларускага саюза жанчын Алена БОГДАН.** — Яны кажуць аб тым, для чаго важны мір, як яго захаваць і ў нашай краіне, і на ўсёй планеце. Жанчыны адчулі сябе той грамадскай сілай, якая працуе на карысць дзяржавы, адстойвае інтарэсы сваёй краіны: праз добрыя справы, падтрымку сем'яў, тых людзей, якім неабходная дапамога, шматлікія акцыі, заявы Беларускага саюза жанчын супраць санкцый, у складанай сітуацыі, якая ў нас склалася на заходняй граніцы, калі мы абсалютна па розных пытаннях звярталіся і да нашых грамадзян, і да сусветнай супольнасці. Жанчыны сёння з'яўляюцца аб'яднальнай сілай, якая рэальна можа многае».

Беларускі саюз жанчын з'яўляецца адной з найбольш масавых грамадскіх арганізацый у краіне. На цяперашні момант у яго складзе — звыш 150 тысяч чалавек. Жанчыны разумеюць, што іх чуюць, а справы, якія яны робяць, патрэбныя нашаму грамадству і дзяржаве.

— На ўсе часы роля жанчыны — вельмі адказная місія, — зазначыла **начальнік Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама, старшыня Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага саюза жанчын Вольга ЧАМАДАНАВА.** — Найперш, яна жыццё чалавеку дае і краіну абараняе. Правядзенне такіх форумаў з'яўляецца рэальнай магчымасцю выказаць нашым жанчынам сваю грамадзянскую пазіцыю. Мы кажам аб тым, што мы, як і кожны грамадзянін нашай краіны, любім і абараняем нашу Радзіму. Свайі справай у першую чаргу.

Па выніках форуму была прынята рэзалюцыя.

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА.

Выстаяць і стаць больш моцнымі

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА і пасол Расійскай Федэрацыі Барыс ГРЫЗЛОЎ абмеркавалі пытанні двухбаковага супрацоўніцтва

Вітаючы пасла ў Палаце прадстаўнікоў, Уладзімір Андрэйчанка на афіцыйным узроўні павіншаваў Барыса Грызлова з пачаткам дыпламатычнай місіі ў нашай краіне. Спікер ніжняй палаты парламента заўважыў, што пасол добра ведае нашу краіну, а таму разумее, якое важнае значэнне для нас мае развіццё, а таксама паглыбленне беларуска-расійскага супрацоўніцтва.

— Асабліва ў гэты няпросты час, калі аказваецца беспрэцэдэнтны ціск, эканамічная блакада, будзем казаць — удушэнне Беларусі і Расіі шляхам санкцый, шантажу, — акцэнтаваў увагу Уладзімір Андрэйчанка. — Па сутнасці, сёння развязана інфармацыйная і эканамічная вайна супраць Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Я ўпэўнены, што мы выстаім і будзем наймацнейшымі.

Адказ на гэтыя нагрозы, па словах Старшыні Палаты прадстаўнікоў, відавочны: па выніках мінулага года ў дзвюх краін склоўся тавараабарот больш чым на 40 млрд долараў. У бягучым годзе рост тавараабароту — практычна 30 %. Прычым 80 % узаемных разлікаў паміж суб'ектамі гаспадарання адбываецца ў нацыянальнай валюце.

«Важна, што сёння і расійскія калегі, і мы актыўна працуем над пытаннямі саюзнага будаўніцтва, — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка. — Аснова створана вельмі добрая — гэта 28 саюзных праграм, зацвердженых дэкрэтам Вышэйшага Дзяржсавета. Асабліва важна, каб мы глядзелі ў заўтрашні дзень. Мы павінны сёння выбудоўваць новую доўгатэрміновую стратэгію развіцця Саюзнай дзяржавы з улікам бягучых абставін. Вялікая работа, якая ўжо пачалася, чакаецца па ўнясенні зменненняў і дапаўненняў, па збліжэнні нашых нацыянальных заканадаўстваў».

У межах 28 галіновых праграм па будаўніцтве Саюзнай дзяржавы плануецца прыняць да 400 законаў: маюцца на ўвазе і законы ў Расіі, і законы ў Беларусі. Акрамя таго, на сустрэчы абмеркавалі пытанні, якія датычацца бюджэту Саюзнай дзяржавы. На цяперашні момант ён складае каля 5 млрд расійскіх рублёў у год.

— У сувязі з тым, што ўзмацнілася наша ўзаемадзеянне ў межах пабудовы Саюзнай дзяржавы, неабходна будзе на 2023 год казаць аб павелічэнні бюджэту і насычэнні яго новымі праграмамі, — адзначыў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Барыс Грызлоў, удакладніўшы, што Мінск з'яўляецца для яго дарагім і родным горадам, дзе ён быў ужо звыш 50 разоў. — На ўсіх узроўнях расійска-беларускія адносіны выйшлі на вельмі высокую планку. Па лініі ААН і шматлікіх міжнародных арганізацый заўсёды прадстаўнікі Расіі і Беларусі галасуюць аднолькава. У нас не тое, што падобныя, у нас аднолькавыя пазіцыі. Апошнім часам вельмі частыя сустрэчы і кіраўнікоў нашых краін. Рэгіёны Расійскай Федэрацыі рэгулярна прыязджаюць у Рэспубліку Беларусь для таго, каб абмеркаваць пытанні ўзаемадзеяння ў галіне прамысловасці, культурнай і спартыўнай дзейнасці. Гэтыя візіты не толькі дзеля таго, каб адзначыць нашы добрыя адносіны, а яшчэ і павышаць тавараабарот. Важна і тое, што ва ўмовах такога санкцыйнага ціску, які аказвае на нас калектыўны Захад на чале з ЗША, мы знаходзім магчымасці імпартазамяшчэння. Гэта важны кірунак, які прывядзе да таго, што мы на працягу бягучага, магчыма, паловы наступнага года пазбавімся ад імпартных вырабаў у вытворчасці нашай прадукцыі. Гэта толькі эўмоцніць нас.

Падчас сустрэчы беларускі бок праанансаваў міжнародную канферэнцыю, прысвечаную Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Вераніка КАНЮТА.

На слыху

Атрымаць павышаную пенсію

Сёння кожны працоўны пенсіянер па ўзросце можа паўплываць на памер сваёй пенсіі. Аб гэтым паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

«Сёння кожны працоўны пенсіянер па ўзросце можа паўплываць на памер сваёй пенсіі. Працюючы без атрымання пенсіі, у далейшым можна атрымліваць павышаную. Гэта і ёсць адкладзеная пенсія», — паведамілі ў міністэрстве.

Механізм тут наступны. Вы дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту (63 гады для мужчын, 58 гадоў для жанчын), і вам прызначана пенсія па ўзросце на агульных падставах, але вы працягваеце працаваць і адмаўляецеся ад атрымання пенсіі. Пасля завяршэння перыяду адмовы вы атрымліваеце бонусы: павелічэнне пенсіі за дадатковы стаж (за перыяды працы без атрымання пенсіі), прэміяльнае павышэнне пенсіі.

Для гэтага трэба адмовіцца ад атрымання пенсіі не менш як на два месяцы; падаць адпаведную заяву ў орган сацыяльнай абароны па месцы знаходжання пенсіённай справы; працягваць працаваць з заработнай платай, не ніжэйшай за мінімальную; пасля завяршэння выбранага перыяду адмовы звярнуцца па аднаўленне выплаты пенсіі і не пераразлік з улікам прэміі; падаць адпаведныя заявы ў орган сацыяльнай абароны па месцы знаходжання пенсіённай справы.

«Напрыклад, жанчына са стажам 35 гадоў і заработкам на ўзроўні 90 працэнтаў ад сярэдняй зарплаты работнікаў у краіне (індывідуальны каэфіцыент зарплаты — 0,9) атрымала пенсію ў красавіку 2022 года ў памеры Br532. Калі б яна працавала і адмовілася ад атрымання пенсіі на 3 гады, то пенсія ў красавіку 2022 года была б Br743. Пры рабоце без пенсіі 5 гадоў яе памер быў бы Br971», — растлумачылі ў ведамстве.

«ДЗЕНЬ, ПОЎНЫ РАДАСЦІ, НАСТАЎ. СЁННЯ ПАН ХРЫСТУС З ГРОБУ ЎСТАЎ. АЛЕЛЮЯ!»

Пастырскае пасланне на Вялікдзень 2022 года

Глыбокапаважаныя біскупы, святары, кансэкраваныя асобы, семінарысты, вернікі Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі! Умілаваныя браты і сёстры! Людзі добрай волі!

Урачысты і велічны перазвон, які з самага ранку заграў у нашых святынях, у чарговы раз нагадаў аб радасці таямніцы Уваскрасення нашага Збаўцы і Пана Езуса Хрыста. На працягу многіх стагоддзяў радасным перазвонам Касцёл абвяшчае свету гэтую прайду, якую жанчыны перадалі апосталам: яны сказалі, што сустрэлі Хрыста жывога, Ён уваскрос! Ён перамог смерць! Ён выйшаў з магілы! Ён зноў з намі!

Таму сёння літургія слова Божага яшчэ раз заглыбляе нас у атмасферу гэтай падзеі. Яна вядзе да таго месца, дзе Хрыстус перамог смерць. «У першы дзень тыдня Марыя Магдалена прыйшла да магілы раніцай, калі было яшчэ цёмна, і ўбачыла, што камень адсунуты ад магілы» (Ян 20, 1).

Аднак вучні Хрыста былі настолькі напалоханыя падзеямі, што адбыліся ў Вялікую пятніцу, — напалоханыя тымі пакутамі, якія зносіў Езус, Яго ўкрыжаванне і смерцю, што нават не ўспомнілі, што Езус прадказваў ім раней пра ўсе гэтыя здарэнні. Ні апосталы, ні жанчыны не думалі пра прадказанне Хрыста, што Сын Чалавечы ўваскрэсне з мёртвых, але думалі пра тое, як падрыхтаваць Яго цела на вечны спачын у адпаведнасці з дзеючым законам. Таму калі на трэці дзень пасля смерці Хрыста ў Ерузалеме разнеслася вестка, што Ён уваскрос, што Марыя Магдалена бачыла Яго і што іншыя жанчыны, якім анёл паведаміў пра ўваскрасенне Хрыста, расказваюць пра гэта, таксама апосталы прымаюць гэтыя паведамленні з недаверам.

Дарагія браты і сёстры! Толькі пустая магіла была для вучняў Езуса першым знакам уваскрасення іх Настаўніка. Пустая магіла прымусіла апосталаў усвядоміць, што словы, сказаныя Езусам, споўніліся: «Сын Чалавечы будзе выдадзены першасвятарам і кніжнікам. Яны асудзяць Яго на смерць і аддадуць Яго язычнікам на здзек, бічаванне і ўкрыжаванне, а на трэці дзень Ён уваскрэсне» (Мц 20, 19). Таму неўзабаве яны адчулі другі, яшчэ больш моцны знак. Бо ў той самы дзень Уваскрослы Хрыстус стаў пасярод іх у Вячэрніку: усе бачылі Яго ва ўласным вочы, маглі дакрануцца да Яго, паразмаўляць з Ім і спажываць пасілак (пар Лк 24, 36-42).

Дарагія браты і сёстры! Можа ўзнікнуць пытанне: чаму Касцёл надае гэтай падзеі такі моцны акцэнт і нагадвае пра яе кожны год? Умілаваныя, таму, што Касцёл хоча ўмацаваць нас у перакананні, што праўда пра ўваскрасенне нарадзілася не з жадання, не са сведчання падкупленай варты ці з нейкіх плётак, якія распаўсюджваюцца сярод легкаверных людзей. Уваскрасенне Хрыста — гістарычны факт (гл. Іосіф Флавій, гісторык).

За абвяшчэнне праўды аб уваскрасенні Хрыста Апосталы і Ягo вызначыў зачастую аддаюць уласнае жыццё. Таму, пачынаючы з часоў Апосталаў, кожнае пакаленне хрысціян паклікана сведчыць аб уваскрасенні па просьбе самога Хрыста: «Дык ідзіце і навучайце ўсе народы, і хрысціце іх у імя Айца і Сына, і Духа Святога. Вучыце іх захоўваць усё, што Я загадаў вам. І вось Я з вамі ва ўсе дні, аж да сканчэння веку» (Мц 28, 19-20).

Шаноўныя! Са смерцю Хрыста нічога не скончылася, а толькі ўсё распачалося. Уваскрасенне Хрыста — гэта гарантыя нашага ўваскрасення. Хрыстус першы ўваскрос з магілы, а гэта значыць, што ў свой час і мы таксама ўваскрэснем. Аднак трэба памятаць, што ўзыходжанне да хвалы ўваскрасення адбываецца праз крыж, цярпенні і пакуты. «Але той, хто вытрывае да канца, будзе збаўлены» (Мц 24, 13), — запэўнівае Езус Хрыстус.

Дарагія браты і сёстры! Прайда аб Уваскрасенні Хрыста з'яўляецца асноваю нашай веры і адначасова для нас, вернікаў, з'яўляецца заклікам, каб мы змяніліся і распачалі новае, праведнае жыццё ўжо тут, на зямлі. На жаль, многія народы і сем'і раздзелены з-за сварак, спрэчак, помсты і нянавісці, зайздрасці і гардыні, захоплены пагоняй за матэрыяльнасцю і славай, павялічваецца колькасць разводаў, забойстваў, назіраецца абыякавасць да чалавечай бяды і няшчасця. У свеце ўвесь час ідуць войны, якія нясуць вялікія цярпенні і пустку. Таму сёння, кожнага з нас, святы Павел заахвочвае: «Калі ж вы ўваскрэслі з Хрыстом, шукайце таго, што ў вышынях, дзе Хрыстус сядзіць праваруч Бога; пра тое, што ў вышынях, думайце, а не пра зямное» (Клс 3,1-2).

Шаноўныя! Дык давайце сёння цешыцца радасцю новага жыцця, якое Хрыстус абвясціў нам сваім уваскрасеннем. Кожны наш дзень давайце будзем старацца пражыць паводле вучэння Хрыстовага Евангелля, стваральны вакол сябе атмасферу хрысціянскай любові, дабрыні і міласэрнасці. Няхай Уваскрослы Хрыстус заўсёды прысутнічае ў нашым жыцці, у малітве, у працы, у абавязках, у нашых сем'ях, каб яны былі верныя Богу, адкрытыя на зачатае жыццё і на міласэрнасць да блізкіх. Няхай Уваскрослы Езус навечна загасцюе ў нашым народзе і ў нашай краіне, ва ўсіх нашых супольнасцях, у кожным нашым сэрцы.

Няхай Уваскрослы Хрыстус Пан адорыць нас сваім шчодрым бласлаўленнем. Бо Ён уваскрос! Сапраўды ўваскрос! Я дзялюся гэтай радаснай праўдай нашай веры з усімі вамі, умілаванымі вернікі нашай архідыяцэзіі, з усім народам Божым. Прытуліцеся да Уваскрослага і не аддаляйцеся ад Яго. Няхай гэта станецца асноўнай каштоўнасцю вашага жыцця.

Умілаваныя! Словы Анёла «Яго тут няма; Ён уваскрос, як сказаў», — няхай яшчэ раз прагучаць з пустой магілы Езуса. А калі гэта так, то:

Слёзы з твару выцірайце,
Праганяйце з сэрцаў грэх.
Песні радасна спявайце,
Хай гучыць вясёлы смех.
Уваскрос Пан над панамі,
Ён жыве, Ён зноўку з намі.
Алелюя, алелюя,
Усклікайце: алелюя!

Браты і сёстры! Няхай жа радасна загучыць нашае Мінска-Магілёўскае: Хрыстус уваскрос! Сапраўды ўваскрос! Алелюя! Алелюя!

Усім вам жадаю радасных пасхальных свят. Няхай прайда ўваскрэсення ўзмоцніць нашыя сілы і адновіць надзею.

Поўных Божай ласкі, духоўнай радасці і супакою свят Пасхі Хрыстовай усім вам!

Давяраючы ўсіх вас апецы Божай Маці, на гэты час святкавання ад усяго сэрца бласлаўляю ў Імя Айца, + і Сына, і Духа Святога. Амэн.

Арцыбіскуп Юзаф СТАНЕЎСКІ,
Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.

Сітуацыя

Літоўская мытня хлусіць аб прычынах чэргаў на граніцы

Аб гэтым паведамілі ў Дзяржаўным пагранічным камітэце

Згодна з абмежаваннямі, уведзенымі краінамі ЕС, беларускія і расійскія грузаперавозчыкі павінны пакінуць тэрыторыю Еўразвяза да 16 красавіка. Абмежаваны тэрмін на вяртанне прывёз да значнай колькасці грузавікоў на сумежным баку. Напружанная сітуацыя складваецца ў тым ліку на літоўскай тэрыторыі — на выезд у Беларусь утварыліся шматкіламетровыя пробкі.

«Чэргі сталі яшчэ большымі, а афармленне літоўскім бокам — яшчэ больш павольным. Напрыклад, у пункце пропуску «Мядзінінкай» («Каменны Лог») на працягу апошняга тыдня ў сярэднім выконвалася толькі 45 працэнтаў устаноўленай нормы па афармленні транспартных сродкаў. Не лепшая сітуацыя і ў пункце пропуску «Лаварышкес» («Катлоўка»), дзе афармлялася толькі 60 працэнтаў ад наступнага патоку аўто. А ў літоўскім «Шальчынінкаі» («Беняконі») — 70 працэнтаў транспартных сродкаў», — распавялі БелТА ў Дзяржаўным мытным камітэце. У асобныя дні ў тым жа «Мядзінінкаі» сумежны бок за суткі афармляў толькі 200 аўтамабіляў пры неабходных 500, а ў «Шальчынінкаі» — 130 з прадугледжаных 250.

Аб тым, што беларускім мытнікам літоўскі бок не падае транспартныя сродкі, сведчаць фота з камер відэаназірання, устаноўленых у пунктах пропуску. Беларускі бок прымае ўсе транспартныя сродкі, падачу якіх забяспечвае сумежны бок. Таксама наша дзяржава ў поўнай меры выконвае ўстаноўленыя абавязацельствы і гатова прымаць больш належных норм.

«Нягледзячы на істотную колькасць фур, літоўскія кантрольныя службы не выконваюць сутачную норму па афармленні велікагрузаў. Так, за суткі Літва афарміла 66 працэнтаў фур. У выніку запаволенае афармленне грузавікоў і павелічэнне часу праверак літоўскімі службамі з'яўляюцца рэальнымі прычынамі працяглага чакання афармлення фур, якія ідуць з тэрыторыі Літвы ў Беларусь», — адзначылі ў Дзяржпагранкамітэце.

Беларускі бок у сваю чаргу афармляе роўна столькі фур, колькі выпусціў сумежны бок, і гатовы прыняць нават звыш прапускной здольнасці. «Насуперак відавочным фактам літоўская мытня, каб неяк апраўдаць сябе, публікуе афіцыйныя паведамленні, абвінавачваючы беларускі бок у павольным афармленні. Інфармацыя, якая распаўсюджваецца літоўскімі крыніцамі, не адпавядае рэчаіснасці», — заключылі ў ДПК.

Пётр ДУНЬКО.

❍ **Тым часам**

У БЕЛАРУСЬ — БЕЗ ВІЗЫ

Грамадзянам Літвы і Латвіі з 15 красавіка дазволены бязвізавы ўезд у Беларусь, паведамілі ў Дзяржаўным пагранічным камітэце.

«На фоне працяглых каранавірусных абмежаванняў у грамадзян сумежных краін ЕС цяпер няма магчымасці наведаць свайкоў у Беларусі з прычыны адсутнасці віз. З улікам гэтых абставін, а таксама ў сувязі з набліжэннем прававслаўных і каталіцкіх рэлігійных свят кіраўніцтвам краіны дадзена права бязвізавага ўезду, выезду і знаходжання ў Беларусі грамадзянам Латвіі (а таксама тым, хто мае статус неграмадзяніна Латвіі) і Літвы», — гаворыцца ў паведамленні.

У ДПК дадалі: перасякаць граніцу без візы для названай катэгорыі грамадзян будзе магчыма ў пунктах пропуску на беларуска-латвійскім і беларуска-літоўскім участках граніцы. Гэты парадак дзейнічае з 15 красавіка да 15 мая ўключна. На працягу гэтага перыяду грамадзяне Латвіі (якія маюць статус неграмадзяніна Латвіі) і Літвы могуць скарыстацца правам бязвізавага ўезду ў Беларусь неабмежаваную колькасць разоў і знаходзіцца на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

«Таксама для гэтай катэгорыі прыбываючых дазволена наведванне пагранічнай зоны без пропуску. Для гэтага пры ўездзе ў Рэспубліку Беларусь у пункце пропуску неабходна вусна паведаміць супрацоўніку органаў пагранічнай службы аб намеры наведаць пагранічную зону, указаць населеныя пункты і мэту іх наведвання», — адзначылі ў Дзяржпагранкамітэце.

У ведамстве нагадалі, што для ўезду ў Беларусь усім замежным грамадзянам неабходна прад'явіць сапраўдны дакумент для выезду за мяжу, медыцынскую страхоўку, зялёную карту (пры праездзе на аўтамабілі) і адмоўны ПЦР-тэст або сертыфікат аб вакцынацыі.

Ідэя для бізнесу

ЗДАМ КАЗУ Ў АРЭНДУ!

А ў прыдачу — курак

Днямі знаёмая даслала мне фота сімпатычнага міні-куратніка з нясушкамі. Маўляў, глядзі, як геніяльна. Людзі здаюць курачак разам з дамком на лета ў арэнду. Можа, возьмеш сабе? Будуць на сняданак свежыя рознакаляровыя яйкі, бо нясушкі ў гаспадыні няпростыя, пародзістыя. «Куры для мяне — драбнавата, — адказала я. — Вось калі б казу!» — «А што ты смяешся, чула, што коз у нас таксама пачалі браць напракат, кажуць, што паслуга карыстаецца папулярнасцю ў дачнікаў». Пасля гэтай размовы я вырашыла пашукаць у інтэрнэце гаспадыньку, якая гатова здаць казу ў арэнду. У выніку знайшла толькі адну аб'яву: «Прадаю ці здаю ў арэнду на лета дзве козачкі-першакоткі смешанных парод, бязрогія прыгажуньки, 1,5-2 гіфты малака ў дзень». І адразу ж патэлефанавала, каб даведацца ўсе падрабязнасці.

Пенка і Мілка шукаюць дом на лета

— Добры вечар, вось думаю ўзяць казу ў арэнду. Распавядзіце, калі ласка, падрабязней пра вашых прыгажунек.

— У мяне ёсць дзве козачкі — Пенка і Мілка. Можаце выбраць любую, — з задавальненнем адгукаецца на маю просьбу гаспадыня Святлана. — Козачкам толькі год, маладзенькія. Сказаць, што яны вельмі малочныя і раздоеныя, дык не. Казляняты яшчэ іх смокчуць. Калі будзеце браць, дык я ўжо іх і адсадзіла б. Казінае малачко смачнае, карысное, без паху. Паўтара літра дакладна будзеце мець у дзень. Каза каштуе 250 рублёў. Звычайна людзі аддаюць усю суму. А потым, калі жывёла ім ужо не патрэбная (хтосьці бярэ на тры месяцы, хтосьці — на чатыры), прывозяць мне яе назад, і я вяртаю рэшту. Месяц арэнды каштуе 50 рублёў. Вось і атрымліваецца: калі возьмеце казу за 250 рублёў і прывезяце яе мне праз 3 месяцы, то я вам вярну 100 рублёў.

— А чым яе трэба карміць?

— Я даю раніцай 250—300 грамаў аўса ці казінага камбікорму. І пакуль козачка есць, яе можна спакойна падаіць. І вечарам — таксама крыху аўса, сена ці свежаскошанай травы. Галоўнае, каб яна была не мокрая. Дзі наогул козы ўсёедныя. Моркву прарадзіў, салата перарасла, радыска патрэскалася, кабачкамі завальваешся, яблыкаў нападала і гніюць... Куды ўсё гэта? Вядома, козачцы. Калі сена няма, можна, гуляючы, заадно і венікаў наламаць: з лазы, кляновыя. І дрэва абнаўляецца, і каза сытая.

— Але ж у мяне ніколі не было казы, я нават даіць яе не ўмею... Ці зможаце навучыць?

— Канечне, я вам усё пакажу. Калі прыедзеце, мы жывём недалёка ад Мінска, можаце не самі падаіць пры мне. Там наогул няма нічога складанага. Козы вельмі паслухмяныя, ручныя, стаяць спакойна, нават прывязваць не трэба. Думаю, у вас праблем не будзе, справіцеся. Самае галоўнае, каб адказна ставіліся, далі ў адзін і той жа час: раніцай і ўвечары. Гэта важна. Ну, і старайцеся добра даіць, да апошняй кропелькі, каб не заставалася малака, бо застоі ў вымені потым правакуюць з'яўленне розных бактэрый.

— А дзе ўтрымліваць казу, напэўна ж, патрэбна нейкае памяшканне?

— Удепленага нічога не трэба. Ім хапае на лета і навесу. Добра было б зрабіць загончык, каб яна магла там гуляць, бо козы грызуць дрэвы, кусты, у градкі могуць залезці. Калі адзін раз трапіла, то ўсё, не адвадзіш. Будзе імкнуцца нават праз сетку. Альбо можна навязваць на полі. Летась сям'я ў мяне брала казу ў арэнду, дык яны агарод не садзяць, таму яна ў іх наогул жыла ў дварэ, не ніхто не прывязваў.

— А як вам прыйшла ідэя здаваць коз у арэнду?

— Дачнікі самі мяне прасілі: «А можна нам толькі на лета?» Таму я ўжо так і пішу ў аб'яве: «Прадам альбо здам у арэнду». У мяне ёсць старая каза, 5 гадоў ёй ужо — нам на сям'ю хапае. А вось маладзенькіх козачак куды дзяваць? Яны ж нараджаюцца штогод, па 2-3. Таму прыходзіцца распрадаваць ці здаваць у арэнду. Людзі бяруць казу напракат, як правіла, дзеля дзяцей. Была ў мяне адна пажылая пара. Яны ўсё лета жывуць на дачы. Да іх прывозяць унукаў на канікулы з Мінска. Адна дзяўчынка — алергік. Спачатку яны набывалі для яе казінае малако ў мясцовай гаспадыні. А потым нехта ім параіў, што будзе больш выгадна ўзяць жывёлу ў арэнду. Так у іх двары пасялілася козачка. Дзеці рвалі ёй траву, насілі венікі з галінак, бралі з сабой на прагулку ў лес, яна бегала за імі як сабачка. Увосень яны вярталіся ў горад, таму прывозілі мне казу назад. А ўлетку зноў бралі. Акрамя таго, ёсць людзі, якія арандуюць казу для бабулі, якая зімуе ў горадзе, а як пацяплее, вяртаецца ў сваю родную хату.

— Практыка здачы коз у арэнду вельмі распаўсюджана за мяжой. У адным з чатаў сустрэла каментарый абуранага гаспадара. «Летась дачнікі папрасілі казу ў арэнду для малака. Пайшоў насустрач. Неяк прыйшоў паглядзець, як яны спраўляюцца, — ледзь прытомнасць не страціў. Стаіць каза, прывязана да плота на спёцы, а побач міска з бульбянымі абыскамі». Ну ён пасварыўся з імі і забраў казу. Розныя людзі — рознае стаўленне да жывёлы, тым больш не сваёй... Не баіцеся давяраць сваіх козачак незнаёмым?

— Дык людзі ў мяне адказна падыходзілі. Дзякуй богу, нармальных вярталі. Заўсёды кажу: калі будуць пытанні, я на сувязі, тэлефануйце. А што там можна сапсаваць? Толькі вымя запусціць, калі не падаіць. Але ж яна будзе мекаць, хвявацца, клікаць вас. Як жа не падысці і не падаіць казу?

— А можна ўзяць у арэнду казу з казлянятамі?

— Дык яны ж вам не дадуць малака ніколькі сабраць. У мяне цяпер першакоткі, я з іх наогул малака не бачу. Усё казляняты выпіваюць, ходзяць і смокчуць. Шмат людзей тэлефануе, распытваюць, як і вы. Але глядзець пакуль не прыязджалі. Можа, вырашаюць, што лягчэй проста пайсці і купіць малако, калі ў вёсцы ёсць козы ў гаспадыні. І да мяне прыходзяць, пытаюцца пра малако. Але я продажам не займаюся. Гадую казу для сваёй сям'і. А вось сястра мая, у яе таксама козы, прадае малако, творог, сыры варыць. У яе цэлы бізнес. Людзі ў нас у акрузе бяруць за казінае малако ад 5 да 7 рублёў за літр. Кілаграм казінага сыру каштуе 36—40 рублёў. Я лічу, што браць казу ў арэнду выгадна. Гэта абыдзецца вам танней, чым бы вы плацілі за казінае малако. Ну, самі лічыце: за 50 рублёў вы купіце ўсяго 10 літровых слоікаў, а то і менш. За месяц з арандаванай казы надоіце значна больш малака. Але ж варта ўлічваць, што яе яшчэ трэба карміць. Падумайце, парайцеся. Я заўсёды людзям кажу, што, перш чым браць адказнасць за жывёлу, трэба разлічваць свае сілы. Догляд казы, як ні круці, вымагае дадатковага часу. Раніцай пакарміць-папаіць, падаіць, потым павесці навязаць. Вечарам зноў: прывесці, папаіць-пакарміць, падаіць. Ну, і дома трэба быць штодзень, ужо нікуды ў госці з начоўкай не ад'ездзеш.

Пасля гэтай размовы ўвечары жартам прапанавала мужу ўзяць казу ў арэнду. Той толькі пасмяяўся: «Ага, прыйдзецца тады суседку прасіць не толькі котку карміць, але і казу даіць». Бо мы зусім не дамаседы, часта ад'езджаем на некалькі дзён.

Гэтую козачку можна арандаваць на лета хоць сёння.

Свежыя яйкі да сняданку

Жывучы ў вёсцы, ужо не першы год назіраю, што дачнікі, прыязджаючы на лецішча, купляюць малако ды яйкі ў мясцовых жыхароў. Але часам ахвотных больш, чым тых самых яек. Прадпрымальныя людзі знайшлі выйсце з гэтай сітуацыі. Нядаўна ў сацсетках пабачыла, што адна наша беларуская гаспадынька, якая гадуе курачак сабе на радасць, вырашыла здаваць нясушак напракат. Тым, хто хоча паспрабаваць сябе ў вясковай гаспадарцы альбо проста жадае глядзець на прыгожае. Яна толькі нядаўна агучыла сваю ідэю і вывучае попыт на гэтую з'яву, таму пакуль не гатова раскасаваць пра свой праект. Але, калі ўсё атрымаецца, з радасцю падзелішца досведам. Скажу адно: людзі цікавяцца прапановай (відаць па каментарыях пад публікацыяй у «Інстаграме»), задаюць пытанні: «Колькі яек будзем мець? А як быць, калі захварэюць? Ці можна выпускаць курэй з доміка? Чым карміць нясушак?» Усе рэкамендацыі сваім кліентам гаспадыня дасць пры сустрэчы.

Яйкі бываюць не толькі карычневыя і белыя, але і так званыя велікодныя. Іх колер залежыць, як правіла, ад пароды курэй.

У некаторых краінах, у прыватнасці ў Германіі, Амерыцы, Вялікабрытаніі, Канадзе, актыўна развіваецца бізнес па арэндзе курэй. Дарэчы, попыт на нясушак істотна ўзрос падчас пандэміі. Фермер рыхтуе ўсё неабходнае, каб можна было адразу гэтым карыстацца (а не думаць, з чаго пачаць). У прыватнасці, сам дастаўляе міні-птушкаферму разам з кормам на ўчастак арандатара. Кліент на працягу абаварочнага часу — мінімум два тыдні — два разы на дзень корміць-поіць курэй, перыядычна перасоўвае куратнік на свежую траўку і збірае свежыя яйкі (адна птушка можа знесці каля 5 яечак на тыдзень). А потым вяртае нясушак гаспадару. Калі хтосьці захоча выкупіць іх назусім, калі ласка. Курэй па восені можна пакінуць сабе — для зімняга баршча.

Так выглядаюць пераносныя куратнікі.

У невялічкай нямецкай вёсачцы, дзе я ў студэнцкія часы амаль месяц жыла разам з іншымі валанцёрамі, быў фермер, які развадзіў курэй. Дык вось ён некалькі нясушак у камплекце з мініяцюрным перасоўным куратнікам здаваў у арэнду дзіцячаму садку. Мне падаецца, гэты досвед варты пераймання. Бо дзеці вучылісі даглядаць птушку — кармілі і паілі. Акрамя таго, што ім смалку прывыкаюць дабрыня і адказнасць, яны яшчэ маюць наглядныя ўяўленне, адкуль бяруцца яйкі на іх стале.

Насамрэч ідэя здаваць свойскіх жывёл у арэнду далёка не новая. У савецкія часы, напрыклад, можна было арандаваць карову ў калгаса. Памятаеце, як у мульцыку «Канікулы ў Прастаквашыне» Шарык кажа: «Карова ў нас чыя? Дзяржаўная! Мы ж не напракат узялі». Вось і атрымліваецца, што ўзяць напракат можна не толькі машыну, дзіцячую каляску, вясельную сукенку, карову, казу ды курыцу, а ўсё, што заўгодна. Напрыклад, у Германіі прадпрымальнікі здаюць у арэнду трусоў, пчол і нават сабак. Прадстаўляюць на нейкі час людзям сваіх гадаванцаў і нямецкія прытулкі для жывёл. Але ў іх іншая мэта — знайсці пастаяннага гаспадара для бяздомных коцікаў ды сабачак. Узяць жывую істоту напракат — значна больш гуманна, чым здаваць у прытулак праз некалькі тыдняў пасля пакупкі. Лепш паспрабаваць пажыць з жывёлай часова і зразумець, падыходзіць яна вам наогул ці не.

Амерыканская ж фірма пайшла далей і прапанавала гэтай вясной сваім кліентам незвычайную паслугу — куранят напракат. Гэта звязана з тым, што на Вялікдзень у многіх краінах прынята дарыць усё з выявамі ці ў выглядзе жоўтых камячкоў: пашто'кі, плюшавыя цацкі, дэкаратыўныя свечкі, шаколадныя фігуркі. Мая ж сястра, якая ўжо даўно жыве ў Амерыцы, распавядала, што ў іх свойскіх жывёл часта арандуюць для фотасесій, прывозяць курэй, коз, гусей і нават парсючкоў на дзіцячыя дні нараджэнняў. Дзецям — забава, а фермерам — прыбытак. Праўда, вялікі ён будзе ці малы, залежыць ад аб'ёмаў.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

НЕ ПАДДАЦЦА ЎПЛЫВУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Хто вядзе інфармацыйныя войны? Каму яны выгадныя?

— Яны вядуцца няспешна, пастаянна і дыстанцыйна. І гэта дыстанцыйнае ўздзеянне, як паказвае практыка, прыходзіць з іншых краін, далёкіх ад месца жыхарства людзей, на якіх яно накіравана. Як правіла, інфармацыйныя і ментальныя войны вядуцца з боку больш развітых краін у адносінах да тых, якія развіваюцца. Бяспрэчна, гэта затармажвае развіццё бяднейшых краін на карысць заможных. Не трэба быць вялікім дыпламатам ці палітыкам, каб зразумець, што без краін, якія развіваюцца, не можа быць развітых. Апошнія пастаянна імкнуцца выратаваць свае праблемы за чужы кошт. Мы ведаем, што адрозненне краін, якія развіваюцца, — гэта людзі і іх спосаб мыслення.

— І ці ёсць спосабы не паддацца такому ўплыву?

— Для таго, каб зразумець, як гэтаму супрацьстаяць, трэба ведаць, на якія ўчасткі галаўнога мозгу ідзе ўздзеянне і якія яго асабліваці дазваляюць прымусіць нас рабіць тыя рэчы, якія напачатку здаюцца нам вельмі правільнымі, а пасля час паказвае, што яны былі памылковыя. Калі мы ў гэтым сабе прызнаемся, бывае ўжо позна, бо такія дзеянні часта маюць незваротны характар. Калі мы ў пэўнай афрыканскай краіне, дзе яшчэ няма рэлігіі, пачнём распаўсюджваць нейкае канкрэтнае вераваснанне, то наўрад ці яно зменіцца ў наступных пакаленнях.

Адзінае, што затармажвае ўздзеянне інфармацыйных войнаў, — крытычнае мысленне. Яно дазваляе перабудаваць ход нашых думак, асэнсаваць, што мы былі падманутыя, прычым часта самімі сабой.

Мадэляванне паводзін людзей было праведзена на малпах. У клетцы іх было 10, зверху вісеў банан і стаяла табурэтка. Было нескладана падняцца, сарваць банан і з'есці. Адна кожны раз, калі малпа хацела залезці па банан, як аблівалі халоднай вадой, што выклікала ў жывёлы дыскамфорт. І праз нейкі час малпы спынілі спробы дастаць банан. Так ён і вісеў. У клетку дадавалі па адной новай малпе, якая не ведала, што там адбываецца. Натуральна, яна хацела залезці і сарваць банан, але суродзічы накідваліся на яе і пачыналі біць, і малпа спыняла свае спробы дастаць банан. З часам у клетцы змяніліся ўсе малпы: ні адну з іх раней не аблівалі вадой, але ніхто з іх не рабіў спробаў дастаць банан, бо ведаў, што чамусьці нельга яго браць. І такія ўстаноўкі змяняць дастаткова складана.

Таму калі вядуцца дыстанцыйныя ментальныя войны, то нават пасля змены пакалення нашчадкі будуць паўтараць тое, што рабілі папярэднікі, нават не ведаючы, чаму. Гэта мае дастаткова цяжкія наступствы для грамадства.

— Менавіта таму большая частка людзей павінна мець крытычнае мысленне?

— Гэта ўвогуле ўласцівасць чалавека будучыні. Згодна са справаздачай сусветнага эканамічнага форуму пра ўласцівасці, якія спатрэбяцца чалавецтву, на першым месцы знаходзіцца наяўнасць крытычнага мыслення. Любая цывілізаваная краіна павінна мець пераважную большасць людзей з крытычным мысленнем. Каб развівацца і рухацца наперад, людзі мусяць мець крытычнае мысленне, а не шаблонныя паводзіны. Бо з шаблоннымі паводзінамі мы топчамся на месцы, паўтараючы тое, што рабілі іншыя.

— Дык што ж такое крытычнае мысленне?

— Паводле такога аўтара, як Том Чатфілд, крытычнае мысленне — гэта ўменне ацаніць сітуацыю максімальна аб'ектыўна. Іншымі словамі, крытычнае мысленне — гэта здольнасць чалавека з дапамогай розных прыёмаў рабіць абгрунтаваныя высновы і прымаць узважанае рашэнне. Натуральна, з крытычным мысленнем ніхто не нарадзіўся, яго трэба развіваць. Яно не працуе пастаянна — 24/7, гэта ўсяго толькі інструмент, які мы павінны выкарыстоўваць, калі нам варта прымаць пэўныя рашэнні. Менавіта ў такія важныя моманты яно нам неабходна.

Увогуле, у 1910 годзе гэты тэрмін упершыню ўжыў амерыканскі філосаф і педагог Джон Дэюі ў кнізе «Як мы мыслім». Раней крытычнае мысленне было прэрагатывай эліты. З-за яго людзей спальвалі на вогнішчы і рабілі вогнарагамі, бо яны нязручныя для сістэмы, у якой жылі. Чалавек з крытычным мысленнем не будзе слепа выконваць любы загад, перш чым нешта рабіць, ён уважаюць «за» і «супраць», будзе задаваць нязручныя пытанні. Цяпер жа крытычнае мысленне ператвараецца ў неад'емную частку якасцяў чалавека будучыні.

— Праз якія сродкі і каналы адбываюцца інфармацыйныя і ментальныя войны?

— Раней, калі не было хуткага абмену інфармацыяй, гэта рабілася з дапамогай кніг, публікацый. Але трэба было ўздзейнічаць на чалавека, каб ён чытаў пэўныя кнігі, газеты ці глядзеў адпаведныя каналы. Цяпер, калі ёсць сусветная інфармацыйная сістэма ці павуцінне, як называюць інтэрнэт, стала лягчэй. Каб паглядзець пэўную праграму на YouTube, мы ўбачым мноства вокнаў — кожны раз нам прапануюць іншыя праграмы, рэкламу, карцінкі. Мы, скажам, хочам набыць пральную машыну і шукаем яе ў інтэрнэце, але за гэты час убачым мноства іншых аб'яў. Наша свядомасць іх паглынае і нейкім чынам пераконвае ў тым, што нам патрэбны і гэтыя тавары. Гэтыя тэхналогіі з кожным годам удасканальваюцца. Некалі папулярны 25 кадр — ужо штосьці старое як дыназаўр, сучасныя тэхналогіі дазваляюць больш масіравана ўздзейнічаць на нашу падсвядомасць і галаўны мозг.

«Крытычнае мысленне дае нам магчымасць не толькі не быць падманутымі збоку, але і самім сабе не падманваць».

— На каго разлічаны інфармацыйныя войны?

— На людзей розных узростаў, пачынаючы з дзіцячага да пажылога, характараў, узроўню адукаванасці, палітычных сімпатый і статусу ў грамадстве. На ўсіх гэтых людзей маюцца свае рычагі ўздзеяння і свае «кнопкі».

Інфармацыйныя войны прымянялі стагоддзі таму. У свой час усіх апярэджвала Вялікабрытанія. Прыкладам таго, што яны могуць быць разлічаны на разумных людзей з высокім узроўнем інтэлекту стала нашумелая гісторыя чэрпала з падпіленым падбародкам, які прапаноўвалі як адсутнае звяно, што адрознівае чалавека ад малпы. Ён шмат гадоў знаходзіўся ў музеі навукі Вялікабрытаніі і яму была прысвечана бясконцая колькасць навуковых работ. І кожны раз, калі вучоныя хацелі яго выкрыць, ім давалі не арыгінал, а слепак. У выніку, калі дабраліся да сапраўднага чэрпа, аказалася, што ён падпілены. Было змарнавана столькі часу і сіл на вукоўцаў, і калі б яны іх патрацілі на сапраўдныя праблемы чалавецтва, карысці было б нашмат больш.

У часы, калі Індыя была калоніяй Вялікабрытаніі, вядомая такая гісторыя: калі хлопец ударыў карову, якая разлегласа пасярод дарогі, каб яе прагнаць і маглі праехаць машыны, то пасол Вялікабрытаніі выйшаў са сваёй машыны і пачаў маліцца на гэтую карову. Усе гэта ўбачылі, пачалі сварыцца на гэтага хлопца і таксама малілісі. Калі пасол вярнуўся ў сваю машыну, кіроўца спытаў: «Чаму вы так паступілі?» Ён адказаў: «Пакуль яны моляцца на гэтую карову, мы можам імі кіраваць».

— З узростам мы можам страціць крытычнае мысленне?

— Мозг, як і мышцы, калі не трэніраваць, атрафіруецца. Калі мы на працягу жыцця атрымліваем новыя навыкі, напрыклад, вывучаем замежныя мовы, займаемся новымі відамі спорту, у нашым галаўным мозгу выбудоўваюцца новыя нейронныя сувязі, ён пастаянна працуе. Калі мы перастаём яго трэніраваць, не чытаем кніг, не павялічваем веды, мозг пачынае атрафіравацца, у нас пагаршаецца памяць. Вядомы факт, што людзі з разумовай работай жывуць даўжэй. Калі паглядзець на вучоных, якія ў сталым узросце атрымліваюць Нобелеўскую прэмію, яны істотна адрозніваюцца ад іншых старых. Гэта сведчыць пра тое, што разумовыя здольнасці і крэатыўнае мысленне можна захоўваць да глыбокай старасці. І тут многае залежыць ад нашага ладу жыцця.

